ПАДЗЕЯ

# ДА ШТЫКА ПРЫРАЎНЯЎШЫ ПЯРО

**Чарговую прэзентацыю зборнікаў літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, гродзенскія пісьменнікі прымеркавалі да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. Мерапрыемства адбылося 17 чэрвеня ў Гродзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі.**



Грамадскасці былі прадстаўлены выданні: паэтычны зборнік «Память огненных лет» (2025); зборнік прозы і публіцыстыкі «Поле памяти» (2025), а таксама зборнік літаратурных твораў «Памяти вечный огонь» (2024), прымеркаваны да 80-годдзя Вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нагадаем: кнігі сталі вынікам супрацоўніцтва Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі з гарадской і абласной ветэранскімі арганізацыямі горада над Нёманам. У ходзе мерапрыемства таксама былі прэзентаваныя іншыя выданні з удзелам гродзенскіх аўтараў: зборнік прысвячэнняў сучасных пісьменнікаў Гродзеншчыны вобразам класікаў беларускай літаратуры «Песнярам Айчыны» (Гродна, 2022);

міжнародны літаратурна-публіцыстычны праект «Книга памяти 1941-1945» (Казань, 2025) і расійска-беларускі літаратурны зборнік «Победили! Перамаглі!» (Санкт-Пецярбург, 2024).




На сустрэчы з кнігамі пра самую крывавую вайну і аўтарамі твораў з іх прысутнічалі настаўнікі школ з розных раёнаў Гродзенскай вобласці. З прамовамі выступілі: метадыст цэнтра ідэалагічнай, выхаваўчай і сацыяльнай работы Дзяржаўнай установы адукацыі «Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі» Любоў Леанідаўна Бірукова; старшыня раённай ветэранскай арганізацыі Кастрычніцкага раёна горада Гродна палкоўнік у адстаўцы Уладзімір Феадосьевіч Цюцюннік; старшыня камісіі па працы з моладдзю і патрыятычным выхаванні насельніцтва Кастрычніцкага раённага Савета ветэранаў г. Гродна, ветэран вайны ў Афганістане, палкоўнік у адстаўцы Аляксандр Васільевіч Балібрух; старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса, празаік Людміла Антонаўна Кебіч. Была адзначана надзвычайная важнасць асветніцкай ролі сучаснай мастацкай літаратуры; слова было названа магутнай зброяй у развязанай гібрыднай вайне, вайне, якую фактычна ўжо можна лічыць Трэцяй сусветнай. Яна вядзецца у душах і розумах людзей, у сістэмах іх каштоўнасцяў. У жорсткай бітве за нашу будучыню сышліся сілы святла і сілы цемры – гістарычная праўда і маніпуляцыі свядомасцю, сакральныя традыцыі і нізінныя інстынкты, славянскі свет і свет подлага, бяздушнага капіталу. Ветэраны працы і ўзброеных сіл заклікалі літаратараў, як ужо здаралася ў мінулыя эпохі, прыраўняць пяро да штыка. А педагогам была дадзена парада больш увагі надаваць сучаснай літаратуры і гаварыць, гаварыць, гаварыць з дзецьмі і падлеткамі пра вайну. Не дазваляць фэйкам узяць верх над ісцінай, не даваць магчымасці нашым ворагам пасеяць хаос і смуту. Шмат разоў прагучала слова «ідэалогія»…

З уласнымі творамі выступілі прадстаўнікі сучаснай літаратурнай супольнасці Гродна – члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, пераможцы абласных літаратурных конкурсаў, прадстаўнікі Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея», аўтары-пачаткоўцы. Прагучалі песні ў выкананні Людмілы Пенталь і Ксеніі Лявонавай.

У праграме прэзентацыі прынялі ўдзел амаль два дзясяткі аўтараў рознага ўзросту. Увазе аўдыторыі былі прадстаўлены аўтарскія вершы, эсэ, нарысы, успаміны ваенна-патрыятычнай тэматыкі на беларускай і рускай мовах.


ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ


КНИГА ПАМЯТИ
1941 - 1945
ПОБЕДИЛИ!
ПЕРАМАГЛІ!
ПЕСНЯРАМ
АЙЧЫНЫ

Пачутае нікога не пакінула абыякавым. Напрыканцы мерапрыемства, якое стала своеасаблівым літаратурным марафонам і доўжылася амаль тры гадзіны, гродзенскія паэты і празаікі прапанавалі педагогам вобласці сяброўства і супрацоўніцтва. Можна не сумнявацца, што прапанова будзе прынятая. Прэзентацыі калектыўных літаратурных выданняў сучасных прынёманскіх аўтараў, прысвечаных 80-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, у Гродне і Гродзенскай вобласці працягваюцца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** удзельнікі і незабыўныя моманты прэзентацыі зборнікаў літаратурна-мастацкіх твораў сучасных літаратараў Прынёмання, прысвечаных 80-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі». Гродна, 17 чэрвеня 2025 года.











Выступае Л. Л. Бірукова




А. В. Балібрух





Л. А. Кебіч і У. Ф. Цюцюннік






Выступае Л. А. Кебіч




Старшыня Гарадскога Савета ветэранаў г. Гродна, член СПБ, публіцыст Аляксандр Радзівонаў



«Дзіця вайны», патрыярх беларускай паэзіі Прынёмання, член СПБ Браніслаў Ермашкевіч





Спявае Людміла Пенталь





Член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык
Член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэт Станіслаў Вішнеўскі




Выступае член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Вольга Пянькова



Увага: новае імя! Даследчык гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, аматар літаратуры Вера Пазьняк



Член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Лілія Шэлешка




Сваё педагагічнае эсэ прадставіла член СПБ, празаік Ліна Багданава (педагог Г. А. Богдан)





Пераможца абласных літаратурных конкурсаў, член СПБ, паэт, публіцыст Андрэй Татур

Пераможца Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча ў намінацыі «Адкрыццё года», паэтэса, публіцыст Юлія Мельнік




Член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая



Увага: дэбют! Загадчык бібліятэкі гімназіі № 6, аўтар-пачатковец, паэтэса, празаік Юлія Чэмерыс









Пераможца шматлікіх рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў, паэтэса Вольга Алізар
Член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Соф'я Судзьіна






Людміла Антонаўна прадэкламавала свой верш «Я – дачка ветэрана»
Маладая спявачка Ксенія Лявонава выканала песню «Весна Победы» на словы гродзенскай паэтэсы Соф'і Судзьінай





Выступаюць члены Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэсы Святлана Барнавалава і Таццяна Лугавая






**Фота** Анатоля Апанасевіча
і Галіны Ясевіч